ЛЕПШАЯ Ў СВЕЦЕ ДЫПЛАМАТЫЯ

Карэспандэнт «Звязды» Анатоль Сланеўскі — з Сочы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вы верылі пасля не зусім удалага спрынту, што сёння ўсё складзецца так шчасліва для вас?

— Вядома, пасля першай гонкі быў такі стан... узрушэння, я б так сказала. Я нічога не чытала, не заходзіла ні на якія сайты, не праглядвала форумы, паспрабавала адключыцца, быць у сабе. Быць сабой. Калі моцна паглыбіцца ў Алімпіяду, можна патануць у кругавароце медыя. А мне патрэбны былі эмоцыі, сілы...

Год таму на чэмпіянаце свету, як і цяпер пасля спрынту, навалілася напружанне, тады я да апошняй гонкі не магла нічога выйграць. Добра, што ў Сочы не стала цягнуць і ўзяла такі доўгачаканы медаль ужо ў другой па ліку гонцы.

— Вы сталі алімпійскай чэмпіёнкай. Што далей?

— Я стараюся не святкаваць перамогі да заканчэння сезона. Алімпійскія гульні працягваюцца, яшчэ трэба будзе шмат пераадолець. Хочацца прыпыніць эмоцыі і проста атрымліваць задавальненне ад кожнай гонкі — ад «індывідуалкі», мас-старту, эстафет.

— А што змянілася ці зменіцца ўнутры вас пасля сённяшняга вечара?

— Ува мне асабіста нічога не змянілася. Я якой была, такой і засталася... Вось яна — я.

— Як праведзяце першы вечар у якасці алімпійскай чэмпіёнкі?

— Допінг-кантроль, дарога ў гасцініцу, масаж... А там з камандай абавязкова пакрычым-патанцуем. Хаця б хвілін 10.

— Шмат хто крытыкуе трасу ў Сочы, многія называюць яе проста небяспечнай. Якой яна здалася вам?

— Тут сапраўды незвычайнае спалучэнне рэльефу і вышыні, мяккі снег. Усім даводзіцца сапці і пацець. Але стан трасы быў лепшым, чым у мужчынскім пасьюце, калі многія падалі. Можа быць, таму, што спускі сёння сталі больш жорсткімі.

— А вы адчувалі падтрымку балельшчыкаў іншых краін, найперш расійскіх?

— Супер! Я, вядома, ведала, што расіяне за мяне «хварэюць», але не думала, што настолькі цёпла... Мяне гналі па трасе, падбадзёрвалі, зараджалі, сустракалі на фінішы.

— Да вашай хуткасці ўсе ўжо прывыклі, але ўпершыню ў сезоне вы адстралялі чатыры рубяжы з адным толькі промахам. Што змянілася ў параўнанні з этапамі Кубка свету?

— У алімпійскі год Кубак свету — самая лепшая трэніроўка. Напэўна, я зрабіла для сябе некаторыя высновы, але ў падрыхтоўцы дакладна нічога не мяняла. Проста зразумела, што трэба быць тут і цяпер і не думаць пра медалі. Настройвайся толькі на працу — і будзе вынік.

— Расіянка Вольга Вілухіна два дні таму расказвала, што паабяцала свайму трэнеру падарыць яму любы аўтамабіль у выпадку алімпійскага медаля.

— Ха-ха! Я нічога не абяцала... Напэўна, толькі сама сябе настройвала і падводзіла да гэтага. Думаю, абавязкова закацім добрую вечарынку — не больш. І толькі пасля завяршэння сезона.

— Ходзяць чуткі, што вы сустракаецеся з Уле Эйнарам Б'ёрндаленам. Гэта праўда?

— Хм... Мы з Уле добрыя сябры. Ну а чуткі пра асабістае жыццё я не каментую. Хай яны так і застануцца чуткамі. Да свайго часу.

СЁННЯ

Месяц
Поўня 15 лютага.
Месяц у сузор'і Льва.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.34	18.14	9.40
Віцебск —	8.27	18.01	9.34
Магілёў —	8.24	18.04	9.40
Гомель —	8.16	18.05	9.49
Гродна —	8.48	18.30	9.42
Брэст —	8.45	18.35	9.50

Імяніны
Пр. *Віктара, Івана, Кіра, Клаўдзія, Мікіты, Нікіфара.*
К. *Арлеты, Катарыны, Рыгора, Юльяна.*

Фота Анатоля КІПЕЛЬЧУКА.

ЗАЎТРА



Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

10 РАСЛІН, ЯКІЯ ПРЫНЯСУЦЬ У ВАШ ДОМ КАХАННЕ

1 Спаціфілум (вядомы яшчэ як «жаночае шчасце»). Прынёсшы гэтую расліну ў дом, адзінокія людзі абавязкова знойдуць сваю другую палавінку. У маладых сямейных пар, якія думаюць пра дзіця, хутка з'явіцца папаўненне. «Жаночае шчасце» заўсёды прыносіць у дом паразуменне і каханне.

2 Фіялка. У доме, дзе расце гэтая кветка, менш сварацца. Таксама многія лічаць гэту кветку знакам вечнага кахання.

3 Гібіскус, ці кітайская ружа. З'яўленне ў доме гібіскуса прадракае неўзабаве гарачае каханне.

4 Хоя (васковы плюшч). У некаторых краінах такую разнавіднасць хоі, як Кэры, дораць на 14 лютага як «валянцінку». Найбольш спрыяльна ўплывае на сямейнае шчасце, калі будзе расці ў спальні.

5 Мірт. Гэтая расліна дапаможа зрабіць ваш шлюб удалым, прынясе ў сям'ю святло і шчасце. У шмат якіх краінах гэтую расліну

лічаць удалым падарункам маладым.

6 Айхрызон. У народзе яе называюць «дрэва кахання» ці «дрэва шчасця». Як відавочна з назваў, прыносіць у дом шчасце і каханне.

7 Калатэя. Гэта расліна лічыцца знакам і захавальнікам шчасця ў доме.

8 Хларафітум. У народзе кажуць, што гэта расліна прыносіць у сямейнае жыццё спакой і шчасце.

9 Кісліца (аксаліс). Калі вам неабходна знайсці сваё каханне ці захаваць сям'ю, абавязкова пасадзіце дома кісліцу.

10 Антурыум («мужчынскае шчасце»). Гэтая расліна прыносіць шчасце і поспех у каханні, а мужчынам — «мужчынскую сілу».

Даты | Падзеі | Людзі

1824 год — у Маскве быў надрукаваны «Беларускі архіў старажытных грамат» — першы зборнік дакументаў па гісторыі беларускіх земляў. Уключаныя ў зборнік 57 дакументаў (актаў) сведчаць аб палітычных сувязях, у многіх з іх адлюстравана дзейнасць князёў і феадалаў, накіраваная на падтрымку і ўмацаванне праваслаўнай царквы ў Беларусі. Ёсць дакументы аб развіцці беларускіх гарадоў і гандлю, фарміраванні гарадскіх саслоўяў, дзейнасці царкоўных брацтваў. Усе акты, акрамя двух (з архіваў Мсціслаўскага Пустынскага і Аршанскага мужчынскага манастыроў) — з архіўных сховішчаў Магілёва.

1945 год — Англа-амерыканская авіяцыя пачынае бамбардзіроўку Дрэздэна, у ходзе якой быў цалкам разбураны цэнтр горада і загінула не менш за 60 тысяч чалавек. Прычынай такой варварскай бамбардзіроўкі з часам назавуць той факт, што горад павінен быў адысці да савецкай зоны акупацыі.

2012 год — упершыню сталі адзначаць Сусветны дзень радыё. Рашэнне аб яго святкаванні ЮНЕСКА прыняла ў 2011-м. Дата правядзення выбрана невыпадкова — менавіта 13 лютага 1946-га ўпершыню выйшла ў эфір «Радыё ААН». Як кажуць заснавальнікі свята, яно павінна паслужыць умацаванню супрацоўніцтва паміж усімі, хто мае дачыненне да радыё, няхай гэта будуць буйныя вяшчальныя кампаніі або адзіночкі-аматары.

Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:

Было сказана

Добры кажух са спагады,
толькі сцюдзёна ў ім;
Добры агонь на чужыне, толькі грызе вочы дым.

УСМІХНЕМСЯ

Канькабежац з Анголы прынёс сваёй зборнай медалі... Дзе ён іх узяў, ніхто не ведае.

— Прывітанне! Як жыццё?

— Ды вось, з'явілася стварэнне, пра якое трэба клапаціцца, зарабляць грошы...

— Ну нарэшце! Віншую! Як яе завуць?

— «Audi»!

Пасля нараджэння дзявятага дзіцяці бацькі ўжо спалі са святлом і пад наглядам дарослых дзяцей.

Дзве сяброўкі.

— Значыць, у цябе ёсць хлопец?

— Так. Моцны, разумны і прыгожы.

— А як завуць?

— Дзіма, Алесь, Анатоль.

НАРОДЖАНЫЯ 13 лютага

Яны энергічныя натуры, якія жывуць з душой наросхрыст, ствараюць вакол сябе дзівосны свет і пастаянна змяняюць свае рашэнні. Яны заўсёды патрабуюць павышанай увагі да сваёй асобы, выстаўляюць напаказ свае пачуцці, не ўмеюць захоўваць сакрэты. Увага для іх — допінг, які дапамагае ўстанаўліваць рэкорды. Іх дэвіз: «Што ні робіцца — усё да лепшага». Яны разумныя, рацыянальныя, але думаюць, што імі кіруе толькі сэрца. З імі лёгка кантактаваць, але цяжка прадугледзець іх наступны крок. Народжаным у гэты дзень неабходна аб'ектыўна ставіцца да сваіх жаданняў і шляхоў іх рэалізацыі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.265. Індэкс 63850. Зак. № 657. Нумар падпісаны ў 19.30 12 лютага 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12